# ФАРМІРАВАННЕ ІЎДЭЙСКАЙ ДЫЯСПАРЫ Ў МЕСАПАТАМІІ

**Г.В. Дзягель**

*УА ФПБ "Міжнародны ўніверсітэт "МІПСА",*
*вул Казінца, д. 21/3, 220099, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь, annadjagel@gmail.com*

Артыкул прысвечаны працэсам на Старажытным Блізкім Усходзе, якія прывялі да стварэння іудэйскай абшчыны і дыяспары ў Вавілоніі, старажытным Міжрэччы, важнага цэнтру яўрэйскага жыцця і антычнасці, месцу стварэння Вавілонскага Талмуду. Мэта – выдзеліць ключавыя этапы фарміравання іўдэйскай дыяспары ў Месапатаміі. Паказаны палітычныя падзеі, што прывялі да знішчэння Ізраільскага і Іўдзейскага царстваў. Вылучана чатыры буйныя дэпартацыі, здзейсненыя асірыйцамі і вавіланянамі. Менавіта у выніку дэпартацый з Іўдэі склалася абшчына, якая не асімілявалася, а захавала сваю ідэнтычнасць, што бачна праз тэаморфныя імены адлюстраваныя ў клінапісных тэкстах Вавілоніі. Менавіта іўдэйская абшчына Вавілоніі стала галоўнай крыніцай аднаўлення іудэйскай абшчыны ў Палесціне.

***Ключавыя словы:*** *Іўдэя; Ізраіль; Вавілон; Асірыя; дэпартацыія; дыяспара; яўрэі.*

# THE FORMATION OF A JEWISH DIASPORA IN MESOPOTAMIA

**H. Dziahel**

*International University "MITSO",*
*ul.Kazintsa 21/3, 220099, Minsk, Republic of Belarus, annadjagel@gmail.com*

The article is devoted to the processes in the Ancient Near East that led to the creation of the Jewish community and Diaspora in Babylonia, ancient Mesopotamia, an important centre of Jewish life and antiquity, the place of the creation of the Babylonian Talmud. The aim is to highlight the key stages in the formation of the Jewish Diaspora in Mesopotamia. The political events that led to the destruction of the Israelite and Jewish kingdoms are presented. Four major deportations by the Assyrians and Babylonians are highlighted. As a result of the deportations from Judea, a community was formed that did not assimilate but retained its identity, as evidenced by theomorphic names found in Babylonian cuneiform texts. It was the Jewish community of Babylonia that became the main source for the restoration of the Jewish community in Palestine.

***Keywords:*** *Judea; Israel; Babylon; Assyria; deportation; diaspora; Jews.*

Існаванне дыяспар у таго ці іншага народу не з'яўляецца выключнай з'явай ні ў сучасным свеце, ні ў Старажытнасці. Так на Старажытным Усходзе нам вядома пра існаванне асірыйскіх гандлевых калоній далека за межмі ўласна Асірыі. Нам вядома пра выкарыстанне замежных наёмнікаў ў Егіпце. Значна паўплывалі на мабільнасць насельніцтва дэпартацыі Асірыйскай і

Навававілонскай дзяржаў і канешне аб'яднанне рэгіёна ў межах дзяржавы Ахеменідаў.

У гэтым кантэксце слушна прасачыць лёс яўрэскага народу, які з прыкладна VII ст. да н.э. да I ст. н.э. прайшоў шлях ад існавання ў межаў уласная дзяржавы (і дзяржаў) да жыцця выключна ў дыяспары. У прыватнасці, важным цэнтрам яўрэскай дыяспары ўжо ў антычны час стала Месапатамія. Менавіта тут быў складзены Вавілонскі Талмуд. Літаральна да сярэдзіны XX ст. у сучасным Іраку захавалася адна з самых старажытных яўрэскіх абшчын.

Мэта дадзенай работы – выдзеліць ключавыя этапы фарміравання іўдэйскай дыяспары ў Месапатаміі.

Пасля перыяду росквіту адзінага Ізраільскага царства пры цару Саламоне, у 931 годзе да н.э. яно падзялілася на дзве дзяржавы: Ізраіль і Іўдэя. Паўночнае царства, Ізраіль, пераўзыходзіла Іўдэю па колькасці насельніцтва, тэрытарыяльна і эканамічна, але было палітычна нестабільным. Паўднёвае царства, Іўдэю, адрознівала палітычная стабільнасць і пераемнасць улады, аднак яна было значна слабей эканамічна. Эпоха падзеленых царстваў працягнулася з X па VI стст. да н.э.

Пачынаючы з дынастыі цара Йеху (841–752 гг. да н.э.), Ізраіль знаходзіўся ў залежнасці ад Асірыі. Перадапошні ізраільскі цар Пеках (740–732 гг. да н.э.) змяніў праасірыйскую палітыку сваіх папярэднікаў і ўступіў у антыасірыйскі саюз з дамаскім царом Рэцынам II. Кааліцыя пацярпела паражэнне, частка ізраільскіх тэрыторый была далучана да асірыйскіх уладанняў, а насельніцтва захопленых тэрыторый было перасялена ў Месапатамію [1, с. 223–225]. У 732 годзе да н.э. супраць Пекаха быў складзены змова на чале з Хашэа, які і стаў апошнім царом Ізраільскага царства. Хашэа плаціў велізарную даніну спачатку Тыглатпаласару III (каля 745–727 гг. да н.э.), а затым яго сыну Салманасару V (727–722 гг. да н.э.). Затым Хашэа паспрабаваў заключыць саюз з Егіптам і спыніў плаціць даніну Асірыі (2 Цар. 17:3–4), за што быў кінуты Салманасарам у турму, а на горад Самарыю (сталіца Ізраільскага царства) пайшла асірыйская армія. Аблога Самарыі, сталіцы Ізраільскага царства, доўжылася 3 гады і скончылася падзеннем горада. Пераемнік Салманасара Саргон II (722–705 гг. да н.э.) у 722 годзе да н.э. правёў дэпартацыю насельніцтва Самарыі. Па словах Саргона II, было перасялена 27290 чалавек [2, с. 469]. Ізраільскае царства спыніла сваё існаванне. Ізраільцян пасялілі ў Паўночнай Месапатаміі, у Газане, Хаворы, а таксама ў захопленых асірыйцамі гарадах Мідыі [3, с. 208–209] (2 Цар. 17:6, 18:11). На месцы Ізраільскага царства была ўтворана асірыйская правінцыя з адміністрацыйным цэнтрам у горадзе Самарыя. У гарады Ізраіля былі перасела арамеі, а пазней халдэі з Вавілона (2 Цар. 17:24). Але сляды

пераселеных ізраільцян далей губляюцца. Перселеныя 10 кален ізраелівых сталі лічыцца згубленымі.

У VIII ст. да н. э. царства Іўдэя таксама патрапіла ў сферу ўплыву Асірыі. Іудзейскі цар Йотам (750–731 гг. да н.э.) адышоў ад антыасірыйскай кааліцыі Арамейскага і Ізраільскага царстваў. А сын Йотама Ахаз (735-715 гг. да н.э.) паслаў Тыглатпаласару III (745–727 гг. да н.э.) дары са скарбніц Храма і палаца [2, с. 466-467]. На працягу ўсяго перыяду найбольшай палітычнай і эканамічнай магутнасці Асірыі (VIII–VII стст. да н.э.) Іўдэя ў асноўным з'яўлялася яе даннікам, акрамя няўдалай спробы паўстання цара Хізкіяху ў 705 годзе да н.э., якое скончылася паразай.

У цэлым, паводле археалагічных сведчанняў, Іўдэя з'яўлялася ізаляванай, аграрнай вобласцю, была беднай (няма слядоў масавай вытворчасці керамікі або вырабу аліўкавага алею на экспарт), маланаселенай краінай (насельнікаў іудзейскай часткі нагор'я было амаль на 10% менш, чым у паўночных рэгіёнах) [4, с. 110–111].

У 627–626 гг. да н.э. у Вавілоне супраць Асірыі было паднята паўстанне, на чале якога стаў халдзейскі князь Набапаласар. У далейшым халдзейскі Вавілон і Мідыя сумесна атакавалі цэнтральныя гарады Асірыі: у 614 годзе да н.э. упаў Ашшур, у 612 годзе да н.э. – сталіца Нінэвія, а ў 610 годзе да н.э. – Харран [1, с. 242]. Фараон XXVI дынастыі Неха II адправіўся на дапамогу асірыйскай арміі ў вярхоўі Ефрата, дзе асірыйцы змагаліся з вавіланянамі [5]. Іудзейскі цар Йошейаху, па невядомай прычыне, выступіў напярэймы егіпецкай арміі і падышоў да Мегіда. У бітве з Неха Йошейаху быў цяжка паранены і неўзабаве сканаў. Атрымаўшы перамогу ў Харана, на зваротным шляху ў Егіпет Неха ў 608 годзе да н.э. захапіў у палон сына Йошейаху Ехоахаза і пасадзіў на пасад яго брата Йехойакіма (Эльякіма) (608-598 гг. да н.э.). Да 605 года да н. э. Йехойакім, верагодна, заставаўся васалам Егіпта. Аднак у гэтым жа годзе сын Набопаласара Навуходанасор нанёс дзве сакрушальныя паразы егіпецкай арміі і, перасьледуючы адыходзячага суперніка, авалодаў Сірыяй [6], тэрыторыяй былога Ізраільскага царства, а затым з'явіўся ў Іерусаліме, прымусіўшы Йехойакіма стаць вавілонскім васалам [2, с. 482–483]. У якасці трафеяў Навуходанасор забраў частку скарбаў Іерусалімскага Храма і адвёў у якасці закладнікаў некалькіх юнакоў з царскага і княжых родаў (Дан. 1:1–6). Але пра масавыя дэпартацыі мовы яшчэ не было.

У 601 годзе да н. э. вавілонскія войскі пацярпелі цяжкую паразу ад Егіпта, і цар Іўдэі Йехойакім паспрабаваў выйсці з залежнасці ад Вавілона. Але ў снежні 598 года да н. э. вавілонскія атрады ўвайшлі ў Іерусалім. У Вавілон была адпраўлена частка святых сасудаў Храма, цар Йехойакім быў заключаны ў аковы для дэпартацыі (2 Хр. 36:6–7), аднак памёр (або быў забіты) яшчэ ў Іерусаліме (Іер. 22:18–19, 36:30). Паводле Іер. 52:28, у

Вавілон было дэпартавана 3023 іўдэя. Такім чынам, у 601 годзе да н. э. адбылася першая іўдэйская дэпартацыя.

Сын Йехойакіма Йехойахін валадарыў у Іудзеі ўсяго 3 месяцы. 15/16 сакавіка 597 года да н. э. цар, яго маці і ўсе набліжаныя здаюцца на літасьць Навуходаносару, які прыбыў у Іерусалім. У Вавілон былі адпраўлены ўсе астатнія скарбы Храма і царскага палаца; дэпартаваны цар, яго сям’я і набліжаныя, а таксама 10 000 іўдэяў, уключаючы 7 тыс. салдат і 1 тыс. рамеснікаў і кавалёў (2 Цар. 24:10–16, 2 Хр. 36:9–10). Лічбы могуць быць недакладныя, але можна сцвярджаць, што дэпартацыя 597 г. да н.э. насіла сапраўды масавы характар.

Царом Іўдзеі Навуходанасор паставіў дзядзьку Йехойахіна Маттанйаху, які атрымаў троннае імя Цідкіяху (597–586 гг. да н.э.). Першыя гады праўлення прыкладна да 589 года да н.э. Цідкійаху заставаўся лаяльным Навуходанасору. Аднак, пад ціскам радыкальных святарскіх колаў і свецкага набілітэта, ён узняў антывавілонскае паўстанне. У адказ вавілонскія войскі пачалі разбураць іудзейскія гарады. 15 студзеня 588 г. да н.э. пачалася аблога Іерусаліма, якая працягнулася да 19 ліпеня 586 года да н.э. [1, с. 247–248]. Цара Цідкіхаху схапілі, на яго вачах былі забітыя яго сыны, а сам ён быў аслеплены і адведзены ў Вавілон (2 Цар. 25:4–7, 19–21). Іерусалім быў спалены. Паводле Іер. 52:29, з горада было дэпартавана 832 чалавека. Дзяржава перастала існаваць.

Іўдэя была пераўтворана ў вавілонскую правінцыю з цэнтрам у горадзе Міцпа. Намеснікам быў пастаўлены Гедалйаху, які быў забіты сваяком цара Цідкійаху, верагодна, каля 581 года да н.э. [2, с. 485]. Таксама ў Міцпе быў знішчаны вавілонскі гарнізон і лаяльныя вавіланянам іўдэі. У якасці пакарання ў Вавілонію былі дэпартаваныя 745 чалавек (Іер. 52:30). З разбурэння Іерусаліма Навуходаносарам ІІ у 586 годзе да н.э. у яўрэйскай гісторыі пачаўся перыяд “Вавілонскага палону”. Біблейскія крыніцы кажуць пра яго як пра жорсткае рабства, хоць з юрыдычнага пункту гледжання іўдэі рабамі не былі, паколькі яны не былі перададзены ў палацавую або храмавую гаспадарку, а былі толькі паселены ў спецыяльна адведзеных месцах. Спачатку гэтыя людзі, відаць, не маглі пакінуць месцы пасялення [7, с. 198]. Танах (Яўрэская Біблія) данёс да нас глыбокую тугу па радзіме і смутак:

*«1 Ля рэк Бабілёнскіх сядзелі мы там і плакалі, Сыён успамінаючы.*

*2 На вербах сярод яго мы павесілі нашыя гуслі.*

*3 Бо там тыя, што нас паланілі, жадалі ад нас словаў песні, і нішчыцелі нашыя – радасці: “Заспявайце нам нешта з песняў Сыёнскіх!”»* (Тегілім 137 (Пс. 136)).

Нягледзячы на гэта, становішча іўдэяў у Вавілоніі было адносна нядрэнным. Яны ўтварылі адну з найбольш важных чужаземных этнічных

груп у Вавілоніі [8]. Частка была паселена ў раёне горада Ніпура. Згодна з дакументамі з архіва гандлёвага дома Мурашу (V ст. да н.э.), каля 8% уласных імёнаў з дакументаў з'яўляюцца яўрэйскімі. Гледзячы па гэтых імёнах, у 28 вёсках, якія размяшчаліся вакол Ніппура, жыло каля ста яўрэйскіх сем'яў. Адны займаліся земляробствам, другія былі агентамі ў прадпрымальніцкіх фірмах, трэція знаходзіліся на царскай службе [7, с. 363–364]. Большасць жа іудзейскіх выгнаннікаў было перасялена, пэўна, у Цэнтральную і Паўднёвую Месапатамію, у апусцелыя падчас войн з Асірыяй раёны; пра гэта сведчаць тапонімы, якія сустракаюцца ў гэтай мясцовасці: Тэль Авіў, Тэль Мелах, Тэль Харса. Пасля стварэння дзяржавы Ахеменідаў іўдэі вавілоніі пачалі перасяляцца ў Палесціну, аднавілі Храм у Іерусаліме і стварылі ахеменідскую правінцыю Йехуд.

Такім чынам, у выніку дэпартацыі ассірыйцамі жыхароў Ізраільскага царства ў 722 г. да н.э. ў Месапатаміі з'явілася яўрэйскае насельніцва, якое праўда, не захавала сваю ідэнтычнасць і было асіміляванае. У выніку масавых дэпартацый насельніцтва царства Іўдэя ў 601, 597, 586 гг. да н.э. у Месапатаміі склалася значная дыяспара, якая здолеа захаваць сваю ідэнтычнасць і ў далейшым стала крыніцай для аднаўлення іўдэйскай абшчыны ў Палесціне.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Тантлевский И.* История Древнего Израиля и Иудеи: от эпохи патриархов до вавилонского изгнания. М. : Ломоносовъ, 2016.

2. История древнего Востока: от ранних государственных образований до древних империй / Е. В. Антонова [и др.] ; под ред. А. В. Седова. М. : Вост. лит., 2004.

3. *Дьяконов М.М.* Очерк истории древнего Ирана. М. : Изд-во вост. лит., 1961.

4. *Бласкес Мартинес Х.-М., Кабреро Пикеро*. Историчность книг Ветхого Завета в свете современной археологии // Вестн. древ. истории. 2008. № 1. С. 97–111.

5. *Довгяло Г.И.* История Древнего Востока : учеб. пособие / Г.И. Довгяло, О. В. Перзашкевич, А.А. Прохоров. Минск : ТетраСистемс, 2002.

6. *Дандамаев М.А.* Государство, религия и экономика в древней Передней Азии (характерные особенности) // Государство и социальные структуры на древнем Востоке : сб. ст. / Акад. наук СССР, Ин-т востоковедения ; отв. ред. М. А. Дандамаев. М., 1989. С. 4–16.

7. *Дандамаев М.А.* Месопотамия и Иран в VII–IV вв. до н. э. = Mesopotamia and Iran in the 7th to 4th centuries b. c.: социальные институты и идеология. СПб. : С.-Петерб. гос. ун-т, 2009.

8. *Smith-Christopher D.* Reassessing the historical and sociological impact of the Babylonian Exile (597/587–539 BCE) // Exile: Old Testament, Jewish, and Christian conceptions / ed. J. M. Scott. Leiden ; New York ; Köln, 1997. P. 7–36.